№ 16 (609)
Красавік 2016 года

# Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года

bfk.by

## У нумары:

☞ Ушанаванне: *краязнавец В. Арцем'еў і пісьменнік У. Федасеенка* – *стар. 2*

☞ Наш каляндар: *М. Ермаловіч і Я. Журба* – *стар. 3 і 5*

☞ Стагоддзі культуры: *адметнасці Івянца і Шчучына* – *стар. 4*

☞ Беларускі след: *камяні для маўзалея* – *стар. 7*

## З Вялікаднем, землякі!



*Скарыстаная выява пісанак Валянціны ПІСАРЭНКІ*

## На тым тыдні...

✓ **20 красавіка** ў Музеі абароны Брэсцкай крэпасці адкрылася **выстаўка «Хатынь. Святыня нацыянальнай памяці»**, падрыхтаваная супрацоўнікамі мемарыяльнага комплексу «Хатынь». Выстаўка складаецца з 8-і банераў з гістарычнымі звесткамі пра вёску і лёсы яе жыхароў. Акрамя таго, на экспазіцыі прадстаўленыя копіі дакументаў аб мемарыяле, значкі і памятныя медалі, прысвечаныя Хатыні.

Выстаўку можна наведаць да 20 чэрвеня.

✓ **22 красавіка** ў Мінску прайшла **«Бібліяноч-2016»**. У акцыі ўзялі ўдзел пяць бібліятэк, кожная мела тэматычную пляцоўку. У Навуковай бібліятэцы БНТУ можна было пагуляць з Клубам настольных гульняў «451» і ўбачыць выступленне тэатра агню «Flamen». Рэспубліканская навуковая медыцынская бібліятэка прапаноўвала праслухаць лекцыю «Катастрофы чалавечага цела» і наведаць музей гісторыі медыцыны Беларусі. У Фундаментальнай бібліятэцы БДУ можна было паглядзець фільм «Гісторыя беларускай страўні» і паўдзельнічаць у майстар-класе па прыгатаванні цукерак з бульбы. Навукова-педагагічная бібліятэка Галоўнага інфармацыйна-аналітычнага цэнтра Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь зладзіла «Кніжны фрымаркет», дзе можна было абмяняцца кнігамі, Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі правяла «Ноч з навукай: чалавек і яго свет».



*«Бібліяноч» у дзіцячай бібліятэцы № 14 г. Мінска*

✓ **23 красавіка** ў Тураве прайшоў **VII Фестываль кулікоў**, які ладзіць грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны» пры падтрымцы Еўрапейскага Саюза. Пад час фэсту разам з вопытнымі арнітолагамі можна было паглядзець на галоўных герояў свята – кулікоў, а таксама турухтанаў, фіфі і больш рэдкіх кулікоў-чырвонакніжнікаў, качак-свіязяў, чорнаваллёвікаў, наведаць станцыю кальцавання птушак. Акрамя таго, пад час фэсту ладзіліся шматлікія майстар-класы, прысвечаныя птушкам.

✓ **24 красавіка** ў Палацы ветэранаў адбыўся **канцэрт фольк-рок гурта «Тутэйшая шляхта»**. Творчасць суполкі – гэта спалучэнне музычнай спадчыны Вялікага Княства Літоўскага, народных беларускіх спеваў і аўтарскіх песень на словы ліцвінскіх і беларускіх класікаў у фальклорнай апрацоўцы. За амаль чвэрць стагоддзя сваёй дзейнасці калектыў выступаў не толькі ў Беларусі, але і ў Польшчы, Германіі, Літве, Латвіі, Эстоніі, Украіне, Расіі.

***Сябры! Падпісчыкі і чытачы, аўтары і адзінадумцы!***

***6 мая ў рэдакцыі «Краязнаўчай газеты» пройдзе Сустрэча краязнаўцаў у «Краязнаўчай газеце». Запрашаем усіх, хто цікавіцца беларускай даўніною, шукае цікавосткі ў мінуўшчыне, рупіцца аб захаванні спадчыны. Удзел прымуць сябры рэдкалегіі і рэдакцыі газеты. Чакаем вас з 12 да 15 гадзінаў.***

***У гэты ж час можаце званіць, задаваць пытанні, дзяліцца думкамі па мінскім тэлефоне (017) 334-42-03.***

✓ **24 красавіка** ў Брагінскім гістарычным музеі з карціннай галерэяй адкрылася **выстаўка «Энергия жизни. Чернобыль. 30 лет»**. Яе арганізавалі Беларускі зялёны крыж і сямейны клуб «Вдохновение» ў межах праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Развіццё патэнцыялу сеткі сямейных клубаў у Чарнобыльскай зоне з мэтай паляпшэння сацыяльна-эканамічнай сітуацыі».

На выстаўцы прадстаўленыя працы беларускіх мастакоў і фатографаў, створаныя пад час леташніх пленэраў. Нягледзячы на сумнае мінулае раёна і сціплыя перспектывы яго развіцця, у творах знайшлі адлюстраванне і станоўчыя моманты: традыцыйная сувязь з зямлёю, клопат аб прыродзе, уласнай гаспадарцы, добрыя стасункі паміж людзьмі, жыццё дзяцей – будучага краіны ды іншае.

✓ **24 красавіка** ў Лошыцкім парку ў Мінску быў адкрыты памятны знак у гонар 70-годдзя заканчэння Другой сусветнай вайны і заснавання Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў. Урачыстая цырымонія адбылася каля Дрэва міру і ўстойлівага развіцця, якое пасадзілі летась Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і намеснік адміністратара ПРААН, дырэктар рэгіянальнага бюро Праграмы развіцця ААН па краінах Еўропы і СНД Джыхан Султанаглу.



*З паштовай скрыні*

## Адказ галоўнаму рэдактару «Краязнаўчай газеты» сп. У. Гілепу на зварот да чытачоў



***Паважаны сп. Гілеп, шаноўная рэдкалегія, шаноўная рэдакцыя!***

Піша вам чытач і аўтар нашай газеты. Разам з вамі заклапочаны тым становішчам, у якім апынулася выданне і, я б глядзеў больш шырэй, краязнаўчы рух нашай краіны. Памятаю, з якой радасцю мы, настаўнікі і краязнаўцы, сустрэлі нараджэнне так патрэбнага выдання ў 2003 г. Трэба адзначыць, вялікі вам дзякуй, зроблена было вельмі шмат, улічваючы, што выданне было пазбаўленае ўсялякай дзяржаўнай падтрымкі. Але выклікае трывогу, што мы, 107 падпісчыкаў, можам стаць апошнімі. Краязнаўчы рух у крызісе, і амаль што згас, кожны варыцца ў сваім соку, спрабуючы на месцах у адзіночку штосьці рабіць... Зразумела, «Краязнаўчая газета» патрэбная ў кожнай школе, клубе, бібліятэцы... Але...

На вялікі жаль, выданню не атрымалася цалкам заняць краязнаўчы сегмент, яно стала цікавым толькі невялічкаму колу мінскіх пісьменнікаў і толькі асобным краязнаўцам на месцах. Але многія з мясцовых краязнаўцаў альбо не ведаюць пра вашае выданне, але, хутчэй за ўсё, ім яно нецікавае. Чаму так?

На маю думку, вам бракуе ініцыятываў, творчых пачынанняў, дыскусійных, актуальных і вострых пытанняў, грамадскіх акцыяў... А таксама метадычных матэрыялаў у дапамогу таму ж настаўніку, вучню і г.д., якія спрабуюць даследаваць гісторыю, духоўную спадчыну сваёй школкі, вёскі, ствараць свой радавод. Тут хочацца прыгадаць, напрыклад, той вялікі пласт, які ў свой час, нягледзячы на складаныя ўмовы, удалося падняць часопісу «Наш край». Канечне, гэта ўсё цяжка зрабіць аднаму невялічкаму калектыву газеты (а запатрабаваны быў бы нават вялікі часопіс!), ды і не патрэбна. На гэта ёсць мясцовыя краязнаўцы, «пазаштатныя карэспандэнты», аўтары. Але яны павінны быць аб'яднаныя, салідарызаваныя, матываваныя... У свой час у вас быў шанц актывізаваць і даць новае дыханне краязнаўчай справе і руху. Я маю на ўвазе ініцыятыву ставарэння (адраджэння) «Краязнаўчага таварыства» як непалітычнай, культурніцка-асветніцкай арганізацыі, а таксама землязтваў, якія б на месцах былі вашым базісам, былі б аўтары, карэспандэнты, падпісчыкі, ініцыятывы (ад мясцовых да рэгіянальных і агульнанацыянальных), была б энергетыка, дынаміка і рух наперад. На той момант я, напрыклад, ведаў асабіста 10 – 15 мясцовых краязнаўцаў, якія б гатовыя былі далучыцца, прачытаўшы ваш матэрыял на вялікай паласе. Але гэтага не сталася...

Таму я ўсёй душой хачу падтрымаць вас у цяжкую хвіліну, перш за ўсё сваёй падпіскай на выданне і інфармаваннем нашай Кармяншчыны, але простымі заклікамі падпісвацца і простымі сустрэчамі ў Мінску праблему не вырашыш.

Прывяду яшчэ такі прыклад. Вось ужо некалькі гадоў я ўдзельнічаю ў Гомельскіх абласных і рэспубліканскіх краязнаўчых чытаннях, дзе з рэгіёнаў і раёнаў удзельнічаюць шмат цікавых і апантаных людзей, ёсць сталыя, а ёсць і маладыя краязнаўцы... Таму, паверце, патэнцыял ёсць. Але няма асновы, якая аб'ядноўвае. І хутка ўсё згасне канчаткова. Таму лічыў і лічу, што нам усім патрэбна аб'яднанне краязнаўцаў (патрэбна пачаць са стварэння «Краязнаўчага таварыства») і іх супрацоўніцтва і салідарнасць, а таксама перабудова зместу газеты: яна павінна быць цікавая настаўніку, вучню, клубнаму работніку, мясцовым краязнаўцам і г.д. І газета магла б стаць арганізацыйна-метадычным стрыжнем такога руху.

*Прабачце, калі мо што было сказана рэзка, але шчыра...*

*З павагай,*
*ваш падпісчык і, здаралася, аўтар, краязнаўца і гісторык з Кармяншчыны –*

*Валерый ВАРГАНАЎ*

# І творчасць, і майстэрства

***У бібліятэцы Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання 14 красавіка адбылася літаратурная сустрэча з былым выкладчыкам Магілёўскага бібліятэчнага каледжа імя А.С. Пушкіна, беларускім пісьменнікам, краязнаўцам Віктарам Арцем'евым.***



Віктар Іванавіч прэзентаваў студэнтам універсітэта і сваім былым навучэнцам тры новыя творчыя працы.

Гэта зборнік «Пісьменнікі і кнігі», які выйшаў з друку ў канцы 2015 г. і надрукаваны ў друкарні Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова. Ён стаў своеасаблівым летапісам літаратурнага жыцця магілёўскага краю. У кнігу ўключаны нататкі, успаміны і эсэ пра сустрэчы з многімі вядомымі пісьменнікамі, згадкі да юбілеяў паэтаў і празаікаў, артыкулы пра кнігі літаратараўземлякоў, тэксты арыгінальных аўтографаў беларускіх пісьменнікаў пра кнігу, лісты Аляксея Пысіна і Янкі Брыля, эсэ-фэнтэзі «Магілёўская абласная бібліятэка ў пачатку XXII стагоддзя». У зборніку змешчаныя артыкулы і нататкі пра Міколу Аўрамчыка, Рыгора Барадуліна, Янку Брыля, Аляксандра Вампілава, Ніла Гілевіча, Якуба Коласа, Янку Купалу, Аркадзя Куляшова, Івана Мележа, Івана Шамякіна, Ігара Шкляраўскага, Яўгенію Янішчыц і іншых (усяго 25 імёнаў і 13 крытычных артыкулаў). Магілёўскаму паэту прысвечаны раздзел «Вянок Аляксею Пысіну». З усімі, аб кім напісаў аўтар, ён быў альбо добра знаёмы, альбо вёў сяброўскую перапіску. У навукова-папулярным выданні таксама змешчаныя фотаздымкі з пісьменнікамі з архіва аўтара. На вокладцы зборніка размешчаны 23 партрэты пісьменнікаў і выявы ўсіх 20-і вокладак кніг В. Арцем'ева.

Потым Віктар Іванавіч пазнаёміў прысутных з сігнальным выданнем новага зборніка – «Пясняр зямлі магілёўскай», у які ўвайшлі яго нарысы аб жыцці і творчасці вядомага паэта Беларусі і Расіі Івана Пехцерава і рэцэнзіі на спектакль па драматычнай паэме «Ці не на крыві, а на любові», а таксама на кнігі, выдадзеныя ў Беларусі ў 2003 – 2012 гг.: «Лугавыя росы», «Мёртвыя сораму не імуць», «Святыні сэрца майго», «Васількаве слова палёў», «Акно ва ўсе часы», «Нябесныя браты», «Зямля між рэчак Іпуць і Лобжанка», «Святло Радзімы». У канцы зборніка дадаткам змешчаныя 70 лепшых вершаў з гэтых кніг і 11 з яго рукапісаў апошняга паўгода зямнога шляху паэта. Кніга прызначаная для шырокага кола маладых паэтаў, філолагаў, літаратараўкраязнаўцаў, а таксама будзе цікавая студэнтам і навучэнцам старэйшага школьнага ўзросту. Віктар Іванавіч з нова зборніка прачытаў аўдыторыі не публікаваныя раней вершы І. Пехцерава.

Таксама В. Арцем'еў пазнаёміў з сваёй публіцыстыкай, апошнім артыкулам «Прыйшла Еўропа да Дунькі», які выклікаў бурнае абмеркаванне ў аўдыторыі.

Да сустрэчы супрацоўнікамі бібліятэкі была аформленая кніжная выстава «І творчасць, і майстэрства», дзе былі прадстаўленыя літаратурныя творы нашага земляка.

*Ірына СІВЯНКОВА, загадчыца бібліятэкі МДУХ*

# Віхры жыцця Уладзіміра Федасеенкі

***Сёлета 22 красавіка споўнілася 90 гадоў пісьменніку, удзельніку Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнцу Жлобінскага раёна і ганароваму грамадзяніну горада Жлобіна Уладзіміру Федасеенку.***




Яго жыццё – прыклад сапраўднага патрыятызму, вялікай любові да Бацькаўшчыны. Калі вораг прыйшоў на нашую зямлю, Уладзіміру было ўсяго 15 гадоў. Але ён узяў у рукі зброю і стаў змагацца з захопнікамі. Спачатку быў разведчыкам створанага ў 1941 годзе знішчальнага батальёна. Сюды юнака ўзяў яго дзядзька Афанасій Мартынаў – «стары камуніст, старшыня калгаса». 12 жніўня 1941 года хлопца схапілі ворагі, збіраліся расстраляць, але перадумалі. Неўзабаве ён здолеў уцячы з палону. А калі фронт адышоў на Усход, Уладзімір стаў байцом партызанскага атрада «Смерць фашызму». У 17 гадоў ён ужо камандзір дыверсійнай групы. За праяўленую мужнасць быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, пазней – ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалём «Партызану Айчыннай вайны» I ступені. Перад самым злучэннем партызанскіх атрадаў з рэгулярнымі часцямі савецкіх войскаў У. Федасеенка быў паранены. Так скончылася для яго вайна.

У мірны час наш зямляк закончыў Гомельскі рачны тэхнікум, потым – Рэспубліканскую партыйную школу, працаваў у камсамоле. Але хутка Уладзімір Канстанцінавіч адчуў сваё сапраўднае жыццёвае прызванне – быць пісьменнікам. У 1972 годзе ён уступіў у Саюз пісьменнікаў СССР. Барацьба з нямецка-фашысцкімі акупантамі стала асноўнай тэмай яго творчасці. Раманы У. Федасеенкі «Дубовая града», «Віхры на скрыжаваннях», «Пасля смерчу» па сваім змесце аўтабіяграфічныя.

– Пра родны куток я думаю пастаянна, – не раз казаў Уладзімір Канстанцінавіч пры сустрэчах са жлабічанамі. – Тут я чэрпаў матэрыялы для сваіх твораў. І ва ўсіх маіх кнігах адна праўда.

У 1999 годзе ўбачыў свет чарговы раман У. Федасеенкі – «Мутныя росы». Гэта апісанне жыцця аднаго пакалення землякоў пісьменніка, якое балюча ўспрымае гібель роднай прыроды.

У. Федасеенка даўно ўжо стала жыве ў Мінску, але да апошняга часу часта наведваўся на Жлобіншчыну – тут ён жаданы госць. У знак вялікай павагі да нашага земляка ў 1998 годзе яму было прысвоенае званне «Ганаровы грамадзянін горада Жлобіна», таксама пісьменнік атрымаў высокую дзяржаўную ўзнагароду – медаль Францыска Скарыны.

*Мікалай ШУКАНАЎ, г. Жлобін*
*Фота Мікалая СЕМЯНЦА*

***На здымку: Уладзімір Федасеенка на святкаванні 70-годдзя вызвалення Жлобіншчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.***

## У тэатры «Зьніч»

**4 мая** маленькіх гледачоў чакае лялечны монаспектакль па п'есе Лявона Мікіты **«Пра ката Сафрона і пеўніка Андрона»** ў выкананні Леаніда Сідарэвіча. Што застаецца рабіць кату Сафрону, калі злая Мачыха выгнала яго з хаты? Выйсце адно: ісці ў белы свет шчасця шукаць. І добра, што ёсць у ката сябры – пеўнік Андрон, котка Нюся, верабейка Ерамей, і не толькі яны.



«Пра ката Сафрона і пеўніка Андрона»

Увечары **11 мая** Мікалай Лявончык прадставіць паэтычны монаспектакль **«Не праклінай, што я люблю…»** паводле вершаванага рамана Ніла Гілевіча «Родныя дзеці». Аўтар інсцэніроўкі і рэжысёр-пастаноўшчык спектакля – Галіна Дзягілева, музычнае суправаджэнне Дар'і Неўмяржыцкай.

**12 мая** на сцэне – лялечная пастаноўка **«Граф Глінскі-Папялінскі»** паводле п'есы Артура Вольскага. Аўтар сцэнічнай версіі і выканаўца – Вячаслаў Шакалідо. Пад час спектакля дзецям распавядуць незвычайную прыгодніцкую гісторыю, што адбылася з двума сябрамі – хлопцам Марцінам і катом Максімам.

У той жа дзень для дарослых гледачоў будзе ісці спектакль **«Выгнанне ў рай»**. Аўтар інсцэніроўкі – Віргінія Тарнаўскайтэ, выканаўца – вядучы майстар сцэны Галіна Дзягілева

**16 мая** на сцэне монаспектакль Сяргея Кавалёва **«Маленькі анёлак»** паводле вершаў Кармэн Барнос дэ Гаштольд. Анёлка-апекуна забытых жывёлаў Бог спусціў на зямлю адшукаць самую няшчасную істоту… Выканаўца спектакля – вядучы майстар сцэны Раіса Астрадзінава, рэжысёр-пастаноўшчык – Галіна Дзягілева.



«Маленькі анёлак»

Увечары для дарослых гледачоў пакажуць паэтычны монаспектакль **«Прыпадаю да нябёс»** паводле вершаў Яўгеніі Янішчыц у выкананні заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь Ларысы Горцавай. Аўтар інсцэніроўкі і рэжысёр-пастаноўшчык спектакля – Галіна Дзягілева, музычнае суправаджэнне Дар'і Неўмяржыцкай.

**19 мая** на сцэне – драматычны монаспектакль **«Абранніца»** паводле «Маленькіх трагедыяў» Аляксандра Пушкіна ў перакладзе Рыгора Барадуліна. Аўтар інсцэніроўкі і выканаўца – Галіна Дзягілева, рэжысёр-пастаноўшчык – Таццяна Пацай, кампазітар – Дзмітрый Смольскі.

**20 мая** ўсе цікаўныя маленькія гледачы лялечнага монаспектакля **«Дзівосныя авантуры паноў Кубліцкага ды Заблоцкага»** выправяцца ў падарожжа разам з выканаўцам Вячаславам Шакалідо. Рэжысёр-пастаноўшчык спектакля – Галіна Дзягілева.

*Спектаклі праходзяць у тэатральнай зале Культурнага цэнтра касцёла Св. Сымона і Св. Алены. Дзіцячыя пастаноўкі пачынаюцца а 15-й гадзіне, дарослыя – а 19-й. Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па мінскім тэлефоне: 331-75-53.*

## Наш каляндар

# Па слядах летапіснай Літвы

***Для многіх зацікаўленне гісторыяй Беларусі пачалося акурат з ягоных працаў. Першыя ж яго публікацыі у часопісах выклікалі сапраўдны ажыятаж. Не будучы прафесійным гісторыкам, высунуў сваю ідэю пра паходжанне і станаўленне Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Днямі яму спаўняецца 95 гадоў з дня нараджэння.***



Нарадзіўся Мікола ЕРМАЛОВІЧ 29 красавіка 1921 г. у в. Малыя Навасёлкі Дзяржынскага раёна. Публіцыст, паэт, празаік, гісторык, педагог выкарыстоўваў псеўданімы Сымон Беларус, М. Ермолов, Я. Мікалаеў, Мікола Наваселец, М. Ярмолаў.

Бацька, Іван Іванавіч, працаваў у калгасе конюхам, у 1937 г. быў рэпрэсаваны, у 1956 г. рэабілітаваны пасмяротна. Маці, Стэфка Юр'еўна, была калгасніцай. У 1938 г. паступіў на беларускае аддзяленне літаратурнага факультэта Мінскага педагагічнага інстытута, да пачатку вайны скончыў тры курсы. З прычыны дрэннага зроку быў вызвалены ад службы ў арміі. Быў эвакуяваны, працаваў настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў в. Лабаскі Мардоўскай АССР. У 1943 г. вяртаецца ў Беларусь; у 1943 – 1944 гг. працаваў настаўнікам у Суражы Віцебскай вобл., у 1944 – 1946 гг. – у Дзяржынску Мінскай вобл. Неўзабаве аднаўляе навучанне ў педінстытуце, які заканчвае ў 1947 г., а ў 1947 – 1948 гг. вучыўся ў аспірантуры пры педінстытуце. У 1948 – 1955 гг. працаваў старшым выкладчыкам беларускай літаратуры ў Маладзечанскім настаўніцкім інстытуце. Да 1957 г. загадваў метадычным кабінетам Маладзечанскага абласнога інстытута ўдасканалення настаўнікаў, пасля чаго па стане здароўя выйшаў на пенсію. Член Саюза беларускіх пісьменнікаў з 1989 г. Жыў у Маладзечне. Трагічна загінуў 5 сакавіка 2000 г. у Мінску.

Асноўнаю ж працаю жыцця стала распрацоўка тэорыі месцазнаходжання гістарычнай Літвы як рэгіёна Беларусі. Вынікам сталі кнігі «Па слядах аднаго міфа» (доўгі час хадзіла самвыдатам, афіцыйна выйшла ў 1989 г.), «Старажытная Беларусь: Полацкі і Новагародскі перыяды» (1990 г.), «Старажытная Беларусь: Віленскі перыяд» (1994 г.), «Беларуская дзяржава Вялікае Княства Літоўскае» (2000 г.). Апошнім часам частку Гродзеншчыны, пра якую пісаў М. Ермаловіч, называюць «Літва Ермаловіча». Ёсць і іншыя выразы, што ўжо сталі заўсёднымі, штампамі ў расповедах пра гэтага выдатнага чалавека. Прыкладам, «яго чакала Беларусь чатыры стагоддзі», «сляпы, які зрабіў відушчымі іншых»…

На шчасце, некаторыя ўзнагароды Мікола Іванавіч атрымаў пры жыцці. За кнігу «Старажытная Беларусь» у 1992 г. атрымаў Дзяржаўную прэмію Беларусі; уганараваны прэміяй імя У. Караткевіча, медалём імя Францыска Скарыны (1993 г.).

М. Ермаловіч за жыццё напісаў таксама шэраг «Гутарак "Аб усім, што баліць"», пісаў вершы, што выходзілі самвыдатам, у недзяржаўных выдавецтвах. Прапануем сёння два ягоныя творы.

*Падрыхтаваў*
*Уладзімір ПІРОГ*



№ 3, 28.11.1975, Менск

*Толькі гутарка ходзіць такая...*
**Я. Купала**

### ГУТАРКА «Навошта свінні рогі?»

Мы жывем у век, калі быллю становіцца не толькі тое, што было ў казках, а нават і тое, чаго не было. Напрыклад, рагатыя свінні! Да такой фантастыкі не дадумалася ніводная казка. Толькі прыказка: «Каб свінні рогі, дык бы яна ўвесь свет заборала б» рабіла намёк на гэта. І тым не менш, рагатыя свінні сталі рэальнасцю. Праўда, бог іх не ствараў. Але некаму, не менш усясільнаму за бога, спатрэбілася іх вывесці нават у той час, калі такі недахоп мясных і сальных свіней.

Доўга я ламаў галаву над тым, чаму гэта незвычайная парода распладзілася ў нас, у Беларусі. Але вось аднойчы пачуў, як прарохкала адна такая свіння:

– Я вечна жыць у Беларусі не сабіраюся. Вось толькі сама адкармлюся і пагадую сваіх парасят, і тады выберамся адсюль.

Мне стала зразумелым, што Беларусь для іх – адкормачны пункт, што іх адзіны занятак у нас – есці і паскудзіць. А паколькі свінні – усяядныя, то ў мяне закраўся страх, што яны могуць усё ў нас паесці і ўзамен пакінуць нам адно паскудства. І мая трывога не была дарэмнай, бо другая свіння самаўпэўнена заявіла:

– Скора ніякай вашай Беларусі не будзе, як не будзе і вас, беларусаў, і вашай мовы. Такую нам далі праграму.

– І што, у гэтай праграме толькі гэта і напісана?

– Не ведаю, можа што і другое там ёсць, але я толькі гэта вычытала.

Я нясмела запярэчыў:

– Знойдуцца ж людзі, якія не дазволяць вам…

Але свіння нават і не сумелася, толькі ашчэрылася і пагрозліва намякнула:

– А рогі навошта?

Цяпер я зразумеў, для чаго выведзены рагатыя свінні.

№ 28(35), 09.07.1976, Менск

*Толькі гутарка ходзіць такая...*
**Я. Купала**

### ГУТАРКА «Пра мову і каўбасу»

Днямі стаю я ў чарзе і чую:

– Гэта ж столькі Беларусь дае мяса, а тут трэба выстойваць няма ведама колькі часу за нейкай нішчымнай каўбасой.

Сказанае мяне не здзівіла. Такое я ўжо неаднойчы чуў, стоячы ў даўжэзных чэргах. Здзівіла тое, хто гэта гаварыў. Голас мне здаўся знаёмым. І я, не верачы сваібе, падумаў: «Няўжо Яўхім Крывенька?» Гэта мой даўні знаёмы. Праўда, я яго ўжо даўно не бачыў, гадоў з пяць. Ён недзе пераехаў жыць у другі канец горада.

Запомніўся ён мне найбольш тым, што спаткаўшыся са мною, заўсёды ўшчуваў мяне за маю беларускасць:

– А вы ўсё гаворыце па-беларуску. Кіньце вы гэту сваю мову. Вунь другія ўжо даўно яе выракліся і жывуць лепш за вас. З ёю нікуды не выб'ешся, з ёю не прадасі і не купіш. Дык навошта яна патрэбна? Ну, хоць бы майму сыну? Ён без яе вышшае абразаванне атрымае. Вось убачыце, што скора на ёй ніхто гаварыць не будзе, хіба толькі вы адзін. І правільна робіць Беларусь, што ад сваёй мовы адракаецца. Без яе можна абыйсціся. Затое ў нас каўбасы шмат, нідзе столькі няма, як у Беларусі. Вунь у Расіі пуста, як вымецена. Там ніякай каўбасы няма, а ў нас якой хочаш…

Я з Яўхімам Крывенькам не спрачаўся, бо хіба такога ў чым пераканаеш? І вось раптам я чую такія словы. А можа гэта не ён? Не, ён. Я яго адразу пазнаў, угледзеўшыся ў чаргу, хоць ён і намнога пастарэў. Падыйшоў да яго. Ён таксама мяне адразу пазнаў.

– Што, па каўбасу стаім? – кажу я.

Яўхім Крывенька адчуваў ніякавата перада мною, відаць, успомніў усё тое, што гаварыў некалі мне.

– Ды вось жа прыходзіцца стаяць.

– А як сын? Паступіў куды-небудзь?

– Ого, паступіш тут у Беларусі, калі сюды з усяго Савецкага Саюза з'язджаюцца. Ведама ж, няма экзамена па беларускай мове. Няхай яны вось паспрабуюць паступіць у Літве.

Вось як! Нават і да Яўхіма Крывенькі дайшло, для чаго існуе родная мова, што аддаўшы яе, аддасі і ўсё астатняе, не атрымаўшы нічога ўзамен, апроч хіба нішчымнай каўбасы.




# Рэальны аптымізм

***У Івянецкім музеі традыцыйнай культуры 2 красавіка адбылася ўрачыстая імпрэза з нагоды 110-годдзя народзінаў слыннага майстра Франца Целяшэўскага (1906 – 1984).***

Мерапрыемства пераўвасобілася ў сапраўднае свята, аздобленае мелодыямі вясны, гукарадамі гліняных свісцёлак, бубна ды дуды, што выконвалі выхаванцы мясцовай дзіцячай школы мастацтваў пад кіраўніцтвам Кацярыны Радзівілавай.

У прасторнай ганчарні музея была наладжаная персанальная выстава керамічных вырабаў і стэнд з фотаздымкамі Франца Ігнатавіча.

Цёплымі ўспамінамі аб бацьку падзяліліся сын Павел і дачка Ганна. Зляцеліся, нібыта птушкі з выраю, шматлікія ўнукі, праўнукі і далучыліся да мястачковай грамады. У гонар юбіляра за ганчарным варштатам дэманстравалі сваё майстэрства Алег Капуста і Уладзімір Сасноўскі. Даспадобы прыйшоўся і майстар-клас па народных танцах мінулага стагодзя.

Творчасць Ф. Целяшэўскага займае адметнае месца ў станаўленні і развіцці Івянецкай школы керамікі. Юнаком навучаўся ў майстэрні Бярнарда Падліпскага, потым два гады ўдасканальваў майстэрства ў Вільні. Атрымаўшы атэстат аб званні майстра, заснаваў уласную ганчарню на родным падворку, дзе плённа працаваў і паспяхова вытрымліваў канкурэнцыю мясцовых рамеснікаў. З усталяваннем Савецкай улады не эміграваў у Польшчу, як зрабілі многія майстры, а застаўся ў Івянцы і спрычыніўся да арганізацыі прамыслова-рамесных арцеляў імя Сталіна і Дзяржынскага, а потым стаў вядучым майстрам на заводзе мастацкай керамікі, дзе працаваў да выхаду на пенсію. Гэта адзіны ганчар у Беларусі, узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Творчасці Ф. Целяшэўскага ўласцівыя наватарскія пошукі ў формаўтварэнні і дэкаратыўным аздабленні керамічных вырабаў. Ад прыроды надзелены музычным слыхам, ён ствараў адмысловыя цацкі-свісцёлкі, спеўныя акарыны і іншыя музычныя інструменты. Напрыклад, гліняная гітара захоўваецца ў фондах Мінскага абласнога музея ў Маладзечне.



Калектыў музея традыцыйнай культуры шмат прыкладае намаганняў па захаванні, адраджэнні і развіцці народных промыслаў і рамёстваў Івянецкага рэгіёна. Для гэтага створаныя спрыяльныя ўмовы пры нашым цэнтры рамёстваў.

Такія мерапрыемствы надаюць аптымізму, верыцца, што адвечныя традыцыі не згінуць, а будуць жыць у новых пакаленнях івянецкіх творцаў.

*Алег РАМАНОЎСКІ, г.п. Івянец*

***На фота Ф. Целяшэўскі***

# З павагай да культурнай спадчыны

***Любоў да роднай зямлі, да культурнай спадчыны свайго народа, да сваіх вытокаў – усё гэта не ўзнікае само па сабе, а выхоўваецца, па крупінцы збіраецца, спазнаецца, зберагаецца, перадаецца ад пакалення да пакалення.***

Шчучынская дзіцячая бібліятэка ў гэтым накірунку вядзе плённую працу. Супрацоўнікі перакананыя, што чалавечая годнасць нараджаецца з глыбокай адданасці сваёй Радзіме, з пашаны да яе спадчыны, ведання гісторыі і сваіх каранёў. Асабліва важна выхоўваць дзяцей і моладзь сапраўднымі патрыётамі, з маленства адкрываць дзецям тыя цуды, якія знаходзяцца побач з намі, на нашай роднай зямлі.

Мы арганізоўваем і праводзім экскурсіі па сваім раёне. Мой нарыс толькі аб частцы тых мясцінаў нашай мілай Шчучыншчыны, якімі можна і любавацца, і ганарыцца. Шмат палацаў і шляхецкіх сядзібаў раскідана тут: у Жалудку захаваўся палац князёў Святаполкаў-Чацвярцінскіх, у Галавічполі – сядзібны дом Іваноўскіх, у Андрушоўцах – уладанні Нарбутаў, сядзіба, флігелі і гаспадарчыя пабудовы, фрагменты парку і саду Марачэўскіх.

Непаўторныя помнікі дойлідства ёсць амаль у кожным населеным пункце. Вельмі цікавыя сваёй архітэктурай касцёлы ў Ішчалне, Старых Васілішках, Каменцы, Васілішках, Ражанцы, Жалудку, цэрквы ў Астрыне, Шчучыне, Ракавічах, Першамайску, Орлі. Вядомы помнік абарончага дойлідства – царква-крэпасць у вёсцы Мураванка, пабudаваная ў 1524 годзе. Гісторыя царквы вельмі ўражвае юных турыстаў, яны бачаць амаль 2-метровай таўшчыні сцены, чатыры вежы з байніцамі, байніцы пад дахам. І уяўляюць з нашых аповедаў, як продкі абараняліся ад ворагаў.


*Сонечны гадзіннік*

Не пакідае нікога раўнадушным касцёл Найсвяцейшай Тройцы ў Ішчалне. Адметны ён як звонку, так і ўнутры. Своеасаблівыя тры алтары і амбон, выкананыя ў стылі ракако. Галоўны алтар выклікае асобную цікавасць. Два бакавых алтары меншыя па памерах, яны ўвенчаныя скульптурамі святых Францішка і Варвары. Вельмі ўражвае майстэрства продкаў: раскрапоўкі, звівы, дробныя, ювелірна вытанчаныя, арнаментальныя клубкі з мудрагелістым узорам. Касцёлу больш за 250 гадоў, а як усё добра ў ім захавалася! Арган, напрыклад, гучыць, як і раней!

На тэрыторыі касцёла знаходзіцца ўнікальны сонечны гадзіннік. Ён уяўляе сабой каменны пастамент вышынёй каля 1 м і дыяметрам 0,5 м, да якога прымацавана круглая пласціна дыяметрам 0,3 м, выгравіраваны цыферблат, прозвішча майстра, месца вырабу, геаграфічная шырата Ішчалны. На жаль, трохвугольная стрэлка зламаная. У сонечныя дні мы паказалі дзецям, як нават з дапамогай кавалачка простай галінкі ў якасці стрэлкі вызначаць час. І, на здзіўленне, час быў вызначаны хвіліна ў хвіліну. Дзеці, атрымаўшы тлумачэнні аб геаграфічнай шыраце, вылічылі яе адносна Ішчалны. Аказалася, што вёска знаходзіцца на адлегласці 3 240 км ад экватара.

Заварожвае архітэктура і ўпрыгожанне гэтак званага «чырвонага касцёла» (касцёл Святых апосталаў Пятра і Паўла) у Старых Васілішках. Уражваюць аконныя вітражы і бакавыя барэльефныя пано, на якіх адлюстраваны Крыжовы шлях Хрыста, капліца-грот, што «распавядае» пра нараджэнне Хрыста, фрэскі, скульптуры, чаканка, разьба па дрэве.

У Старых Васілішках мы наведалі клуб-музей знакамітага земляка Чэслава Немэна. Дзеці мелі магчымасць паслухаць інструмент, які гучаў у доме Выдзыцкіх, дакрануцца да прадметаў ужытку сям'і, паслухаць голас спевака.

Касцёл Святога Антонія Падуанскага ў вёсцы Каменка выклікае адчуванне нейкай асаблівай атмасферы, у ім утульна, цёпла. Дзеці напісалі запіскі да Святога Антонія з самымі шчырымі просьбамі і вераць, што яны здзейсняцца.

Пад час экскурсіяў па раёне мы знаёмім юных турыстаў з легендамі і паданнямі, звязанымі з населенымі пунктамі. Знаёмства з тапонімамі краю – адна з крыніцаў спазнання сваёй гісторыі, каранёў, заняткаў продкаў, асаблівасцяў мясцовасці, разнастайнасці расліннага свету.


*У касцёле Святога Антонія Падуанскага ў в. Каменка*

***Мы бачым, што наша справа дае плён. Дзеці ганарацца роднымі мясцінамі, любяць свой куточак, радзіму. Часцінку таго вялікага і святога, што мы называем словамі «Айчына», «Бацькаўшчына». Доказам таму служыць тое, што ведамі і ўражаннямі ад убачанага і пачутага яны дзеляцца з іншымі на старонках раённай газеты «Дзянніца», часопіса «Бярозка», на сустрэчах з аднагодкамі з іншых навучальных установаў і нават на прэстыжных конкурсах юных карэспандэнтаў. Радуе, што дзеці ўсведамляюць: дзе б яны ні апынуліся пазней, у якіх бы цудоўных палацах-музеях ні пабывалі, яны заўсёды будуць чакаць сустрэчы са сваёй роднай зямлёй, якая адкрыла ім усе свае таямніцы і цуды.***

*Наталля МАТОШКА,*
*бібліятэкар Шчучынскай дзіцячай бібліятэкі*

# Іўе — сталіца беларускіх татараў

***(Працяг тэмы. Пачатак у №№ 11, 14)***

Сярод паселішчаў, дзе цягам стагоддзяў стала жывуць татары, асабліва вылучаецца Іўе, за якім замацавалася назва сталіцы беларускіх татараў. Найперш – гэта таму, што ў часы, калі ў Савецкім Саюзе закрываліся храмы, тут знаходзілася адзіная на тэрыторыі БССР мячэць, што дзейнічала, вакол якой ядналіся татары не толькі Беларусі, але суседніх Літвы і Польшчы. Іўе сярод іншых гарадоў і мястэчак вылучаецца найбольш кампактным насяленнем татараў – тут найбольш выяўляюцца традыцыі татараў, а сярод заняткаў – узорнае агародніцтва.

## З гісторыі пасялення

Паводле падання, тутэйшая абшчына мусульманаў заснаваная ў канцы XIV – пачатку XV ст. «высакародным Батальдам». За ўдзел у Грунвальдскай бітве татары былі аддзячаныя тым, што атрымалі ўрочышча, якое месцілася за кіламетр на поўдзень ад Іўеўскага замка.

У Іўі, згодна Інвентара, у 1561 г. на вуліцы, што вяла да касцёла, і на вуліцы Новай жылі 4 татарскія сям'і, якія займалі шэсць дамоў. Гісторык Я. Тышкевіч у працы «Татары на Літве і ў Польшчы» адзначае, што ў 1567 г. татары складалі 4,3 % ад усяго насельніцтва паселішча.

Паколькі вясной 1597 г. пажарам былі знішчаныя ўсе дамы татараў, тагачасны ўладальнік Іўя магнат Станіслаў Кішка перасяліў татараў за межы мястэчка і на 6 гадоў вызваліў іх ад усіх падаткаў (аднак яны павінны былі штолета адпрацаваць на жніве). У мястэчку на вуліцы Крывой заставаўся толькі Магмет Ардынец, ён меў тут свае пабудовы і агарод. Крывая і Новая (з'явілася пазней) вуліцы вялі да гандлёвай плошчы, на ёй сыходзіліся таксама Віленская (вяла ў бок Вільні), Наваградская (кіравала на недалёкі Наваградак), Касцельная і Конская вуліцы.

У Інвентары за 1598 г. ужо пазначаная Татарская вуліца, але… татараў там не было і названая яна «па старой памяці». У тым жа 1598 г. на новым месцы на дзевятнаццаці надзелах зямлі размяшчалася 13 татарскіх сем'яў.

У 1634 г. татарскія землі збольшага належалі іўеўскім мяшчанам хрысціянам. 9 татарскіх сем'яў працягвалі жыць непадалёк мястэчка, утвараючы асобнае паселішча, жыхары якога са сваіх надзелаў з агародамі, моргаў зямлі і сенажацяў плацілі ўладальніку Іўя чынш. У 1634 г. мястэчкам валодаў сын С. Кішкі Мікалай. Паводле звестак Тышкевіча татары ў гэтым годзе складалі 6,4 % ад колькасці ўсяго насельніцтва Іўя.

У «Гербоўніку татарскіх родаў у Польшчы», выдадзеным у 1929 г. (складальнік Станіслаў Дзедулевіч), апісваецца род Сулеймана Муроўскага, у якога быў сын Муртуза – паручнік князя Януша Радзівіла. У 1652 г. Муртуза атрымаў у дар ад князя маёнтак. Муртуза і яго брат Хасень купілі каля Іўя зямлю, што стала называцца па прозвішчах братоў Мураўшчызна. У гербоўніку згадваюцца і такія татарскія роды, як Александровічы, Багдановічы, Ільясевічы, Радкевічы, Шабановічы, Ясінскія, нашчадкі якіх і цяпер жывуць у горадзе.

У дакументах XVII – XIX стст. Мураўшчызна ўжо згадваецца як пасяленне татараў у ваколіцах Іўя. У XIX – XX стст., калі татары пачалі актыўна перасяляцца з ваколіцаў у гарады і мястэчкі, Мураўшчызна ўвайшла ў склад Іўя. Колькасць татараў цягам стагоддзяў павялічвалася. У 1908 г. налічвалася прыкладна 500 чалавек – гэта 10,3 % ад усяго насельніцтва мястэчка. Паводле некаторых звестак тут жыло да 800 татараў.



*Татарскія агароды*

## Адметнасці з жыцця татараў Іўя: агароды, каляндар, мячэць, ваколіца

Тое, што татары – добрыя гаспадары, не патрабуе асаблівых доказаў. Татарскія агароды радуюць вока: цягнуцца яны ўздоўж вуліцаў, іх дагледжанасць вылучае татарскі падворак. Цяпліцы займаюць па некалькі гектараў. Радыска, агуркі, памідоры, перцы растуць у татараў дзякуючы іх працавітасці і сакратэх, што перадаваліся па спадчыне. Гандаль агароднінай дае магчымасць пэўнай незалежнасці, якая не адмяняе цяжкай працы. Ды й жывуць татары ў звычайных аднапавярховых дамах, якія не вылучаюцца непатрэбнай раскошай.

Каляндар агародніка – месяцовы. І гэта не складае праблему для татараў, бо мусульманскі каляндар заснаваны на руху Месяца. У часы, калі мясцовыя татары не мелі спецыяльна падрыхтаваных мусульманскіх календароў, былі людзі, якія вялі падлік. Цікава, што ў Іўі існуе свая традыцыя весці месяцовы каляндар – «лічыць па-свойму»: байрам (свята) тут пачынаецца на дзень пазней, чым, напрыклад, у Мінску.

Згодна з перапісам Расійскай імперыі 1897 г. у мястэчку Іўе было 387 двароў, 2 828 жыхароў, касцёл, сінагога, праваслаўная капліца, тры яўрэйскія малітоўныя дамы, мячэць. І да Другой сусветнай вайны дзейнічалі храмы чатырох канфесіяў – касцёл, царква, сінагога і мячэць. У чэрвені 1935 г. агнём было знішчана некалькі хатаў і гумнаў вакол мячэці, якая засталася некранутая дзякуючы сумесным намаганням не толькі татараў, але й іншых жыхароў Іўя, якія прыйшлі на дапамогу. Толькі выпадак выратаваў мячэць ад разбурэння ў 1944 г. У ліпені, калі савецкія войскі вызвалялі Іўе, пры артылерыйскім абстрэле адзін са снарадаў ледзь не трапіў у мінарэт мячэці. Гэта адбылося ў пятніцу пад час набажэнства. Пасля Другой сусветнай вайны на тэрыторыі, якая ў 1939 г. адышла да БССР, Іўе заставалася надоўга адзіным месцам, дзе дзейнічала мячэць. Каля Іўя маецца і найбольшая колькасць мізараў – тры. На двух старадаўніх ужо не хаваюць нябожчыкаў. На трэцім мізары найбольш раннія пахаванні датуюцца пачаткам XX ст.

Пасля Другой сусветнай вайны вуліцы пасялення атрымалі новыя, нададзеныя савецкай уладай, назвы. Асноўныя вуліцы, уздоўж якіх размяшчаліся дамы татараў Мураўшчызны, сталі называцца Савецкай і Леніна. Стромкія рады татарскіх агародаў у часы барацьбы з уласніцтвам былі адрэзаныя, і па мяжы падзелу прайшла новая вуліца – Дружба.

16 чэрвеня 2012 г. у Іўі на Дзень горада прыйшлася адметная падзея – адкрыццё памятнага знака «У гонар сяброўства і адзінства канфесіяў Іўеўшчыны» (пра што ў нашай газеце быў адмысловы рэпартаж. – **«КГ»**). Ёсць надзея, што гэта – добры пачатак. Магчыма, будуць узгаданы такімі ж памятнымі знакамі былыя назвы вуліцаў: Віленская (сёння вуліца 1 Мая), Навагрудская (у 1920-я гг. перайменаваная ў вуліцу Адама Міцкевіча, цяпер Савецкая), Касцельная (вуліца К. Маркса), Крывая (вуліца Чкалава), Конская (вуліца Энгельса). І з'явіцца Татарская вуліца.

***(Заканчэнне артыкула ў наступным нумары)***

*Наш каляндар*

# Журботы і радасці Янкі Журбы



**Янка ЖУРБА** (сапраўднае імя Іван Якаўлевіч Івашын) нарадзіўся 30 красавіка 1881 г. у вёсцы Купніна Лепельскага павета. У 1902 г. скончыў Полацкую настаўніцкую семінарыю, настаўнічаў на Віцебшчыне ў пачатковых школах. У 1906 – 1909 гг. вучыўся ў Глухаўскім настаўніцкім інстытуце (Чарнігаўская губерня), пад час вучобы пачаў пісаць па-беларуску. Яго першы беларускі верш, «На беразе Дзвіны», быў надрукаваны ў 1909 г. у «Нашай Ніве». Пасля заканчэння інстытута працаваў выкладчыкам рускай мовы і літаратуры ў старшых класах гарадскіх і пачатковых вучылішчаў Украіны, Беларусі, Расіі, у навукова-педагагічнай камісіі Наркамасветы БССР, інспектарам акруговых аддзелаў народнай асветы, выкладаў у Чэрыкаўскай сямігадовай школе. У 1934 г. пераехаў у Мінск, працаваў у Інстытуце мовазнаўства Акадэміі навук БССР. З-за хваробы вачэй быў змушаны ў 1937 г. пакінуць працу, а ў 1944 г. поўнасцю страціў зрок.

Пасля вайны Янка Журба жыў у Чашніцкім раёне, быў настаўнікам спеваў у пачатковых класах. Пазней жыў у вёсцы Слабада пад Полацкам і ў Полацку ў сваякоў і манашак Свята-Ефрасіннеўскага манастыра. У апошнія гады цярпеў вялікую нястачу і жыў у доме састарэлых у Полацку. Памёр 7 студзеня 1964 г.

Янку Журбе належыць шэраг этнаграфічных нарысаў, якія на працягу 1903 – 1906 гг. ён апублікаваў у газетах «Витебские губернские ведомости» і «Витебский голос». Гэтыя творы, на жаль, яшчэ не адшуканыя. Праца Янкі Журбы атрымала навуковае прызнанне, высока яе ацэньваў краязнаўца М. Каспяровіч: «Быт насялення Віцебшчыны вывучалі шмат якія этнографы. Але самы аб'ектыўны і навуковы падыход да свае справы паказаў першы беларускі этнограф Віцебшчыны – Іван Івашын, вядомы беларускі паэт».

*Падрыхтавала Ніна КАЗЛЕНЯ*

**Янка ЖУРБА**

## Братняй Украіне

*Ніколі не забуду час той шчасны,*
*Калі зычліва мне ўсміхнуўся лёс:*
*У сонечную братнюю Украіну*
*Мяне ён, бы на крыллях, перанёс.*

*Я моцна палюбіў старонку гэту*
*У раннія юнацкія гады,*
*За прыгажосць яе дзівосных песень,*
*Што поўняць сэрца радасцю заўжды.*

*Я палюбіў цябе, край украінскі,*
*За слодыч музыкі бандур тваіх,*
*За харастводы паэзіі Шаўчэнкі,*
*Што цешыць і старых і маладых.*

*Люблю красу садоў тваіх шматлікіх,*
*Калі прыбраны ў бель яны вясной,*
*Твае мне любы месячныя ночы*
*І яснасць зор, што свецяць над табой.*

*Люблю прастор тваёй зямлі ўрадлівай,*
*Імклівы бег магутнага Дняпра*
*І мілагучнасць мовы украінскай,*
*Што мне гучыць званчэй ад серабра.*

*Я не забуду гэты край цудоўны,*
*Што аздабляў тут век мой малады;*
*Мне не забыць сяброў, адданых, шчырых,*
*Якіх тут меў у раннія гады!*

*Я ў думках і сягоння на Ўкраіне,*
*З братамі украінскімі ізноў.*
*Дзень гэты радасцю маёй квітнее,*
*А ў сэрцы зноўку ўспыхнула, гарыць любоў.*

*Мая любоў – да светлай Украіны,*
*Што абудзіла мне ўспамінаў рой*
*Аб незабыўных днях майго юнацтва,*
*Што праплыло ў краіне дарагой.*

*Ніколі не забуду час той шчасны,*
*Калі зычліва мне ўсміхнуўся лёс:*
*У сонечную братнюю Ўкраіну*
*Мяне ён, бы на крыллях, перанёс.*

1960

# «Творчая лабараторыя»



Такую назву атрымала літаратурнае аб'яднанне, створанае сёлета 1 лютага ва Уздзенскай сярэдняй школе № 2 імя Кандрата Крапівы. Мэтай аб'яднання з'яўляецца развіццё ў дзяцей творчага мыслення, пашырэнне кругагляду, набыццё імі навыкаў правільна і граматна размаўляць, узбагачэнне слоўнікавага запасу.

Асноўная задача – выявіць найбольш адораных дзяцей, у якіх ёсць здольнасці да творчасці, навучыць іх пісаць вершы.

Заняткі праходзяць ажыўлена, у вольнай форме. Вучняў займае працэс напісання вершаў. Найбольш умелымі сябе праявілі Максім Зябора, Лізавета Агейчык, Мілана Трус ды іншыя.

На адно з пасяджэнняў быў запрошаны сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі Дзмітрый Вінаградаў. Ён расказаў, як рэалізавалася на практыцы яго дзіцячае жаданне стаць пісьменнікам. Таксама ён правёў з дзецьмі практычны ўрок, даў універсальную схему праверкі рытму верша. Маленькія паэты з захапленнем і цікавасцю слухалі вопытнага дарослага чалавека, задавалі шмат пытанняў. Час быў праведзены карысна, новыя веды папоўнілі школьны багаж.

Падабаецца сябрам літаб'яднання наведваць палац культуры. Там размешчаная бібліятэка імя П. Труса, дзе можна азнаёміцца з цікавымі кніжкамі, з навінкамі літаратуры. Тут арганізаваныя адмысловыя выставы: «Крапівінскі скарб» (прысвечаная 120-годдзю Кандрата Крапівы), «Цуд рукатворны» майстра Людмілы Казак (працы ў тэхніцы «Дыяментавая вышыўка»), «Родныя краявіды» (карціны беларускага жывапісца Андрэя Лычкоўскага).

І надалей мы будзем праводзіць тэматычныя заняткі, сустрэчы з пісьменнікамі, экскурсіі.

*Ліяна ТАПАДЗЭ,*
*кіраўнік літаб'яднання «Творчая лабараторыя»*




# Вялікдзень

Матка, то яйцы пазбірая, павязе ў Гоміль, штоб жа плацці былі, па хустачцы купя каждаму, пяцёра ж нас, усім жа нада. «Мы, – гаворя, – будзім у старым, а вам новінькая нада к Вялікадню». Садімся разгавеймся на Вялікадня, кажды сваё зная. Сундукі такія былі. Мы паложым. І сваё, і платочык, ці тухклі матка купя. Матка: «Разгавейцісь, штоб не абкапалі і не абдзелалі». Наряджаймся, кажды сваё. Ваня наш быў такі, як Сярёжка, падхаласцячок, у яго рубашка, у яго брюкі былі, картуз. Як туклі плахія, туклі купя. Большаму лучшая нада, тада Машы, тады мне, тады Тусі, тады Ягорку. Меньшаму і большаму, ета лучшы усіх.

Вон, перад Вялікаднём – Благавешчанне. Баба: «Сёння – Благавешчанне. Можа, ніхай надзенуць?» Матка: «Ня нада! Вялікадня ё Вялікадня! Ета Гасподні празнік. І ета Гасподні, но ета к Вялікадню шыта». І не надзявалі. «Скажы мне праўду, як Вялікаму дню ў вочы».

Мы калісь у бабы пыталі: «Баб, чаго Вялікадня?» Яна гаворя: «Вялікадня. Гасподзь жа даў Вялікадня. Дак, прымецця, які дзень вялікі. Самы вялікі дзень па-божжаму. Тыя дні – малыя, а еты дзень такі, ужэ, бальшы. І ўсе гаворяць: "Гасподзі! Святоя Вялікадня прышло!"»

Як Вялікаму дню ў вочы *(глядзець, казаць)*.

Сказаць, як Вялікаму дню ў вочы. Баба наша ўсё казала: «І скажы мне праўду, як Вялікаму дню ў вочы».

Што-нібудзь ці гаворыш, праўду ты гаворыш… Глядзіш, як Вялікадню ў вочы. На Вялікадня нільзя не бряхаць, абы-што дзелаць, дажэ з жонкай не спяць.

*[На каго так кажуць?]*

Напрымер, еслі ты ці няпраўду гаворыш, штоб праўду гаварыў. Дажэ косы расчэсываць мужчынам і то нільзя, не то шта бабам. Усё калісь баба наша гаворя, Іван возьмя, бальшы хлопец, дак тады ж не было рясчосак, грябёнкай, баба: «На Вялікадня нічога нільзя, толькі адзеньціся, чысцінька хадзіцца, пад'ешця. Ешця на стале хто калі хоча і як хоча… Ні абеды…

Чылавек еслі праўду гаворя ці будзя завяряць, што яно будзя тоя… Ета вялікі дзень, ета самы Гасподні дзень, такі мілы дзень, справідлівы.

Вялікі дзень – ета ж празнік. Еслі ты праўду гаворыш і ты чэсцен адзін перад адным, ты глядзіш, як Вялікаму дню у вочы.

А еслі ты чым-нібудзь грэшэн ці брэшэш што-нібудзь… Як малы, во, дзіцёнак пачане: «Ягорка, ты шкоду ету здзелаў?» Ён ужо не глядзіць на… А еслі ты, напрымер, ні браў… Еслі ўжо вінават, ты будзіш уніз глядзець.

У мяне адкрытая душа. Я не магу, штоб чалавеку бряхаць. Я не магу чалавека выгнаць без дзела. Еслі ўжо пачне мне плетуханіць. А ў мяне душа адкрытая, як у цэркві после Вялікадня Царскія варата.

Я вот із душы сваёй вазьму, скажу чалавеку ўсю праўду. А Царскія варата, ета, як пряпяюць «Хрыстос васкрэс», расчыняюць Варата, і мужчыны могуць заходзіць, бабы, дак, не.

Дзевачак маленькіх носяць, як родзяцца. Ета – Праводная скрасення. Іх прычасчаяць, маленькіх. І адкрытыя варата.

А тады, ужэ, шэсць нядзель яны будуць адкрытыя, да Ушэсця, тады закрываюць Царскія варата – пашоў Ісус Хрыстос на неба.

Госпадзі, Святоя Вялікадня! Штоб яму Бог павыяў і шлуння, і пячонкі.

Баба гаворя, вот у цэркву далёка, тады ж у нас на Амяльном не было, у Свяцкую хадзілі за сем кіламетраў да ў Вылява, кіламетраў дзесяць, дак баба гаворя: «Бог усё свеця. Давайця вынясім». І выняся на табурэтку, паклодзе, засцеля палаценцам. Пастаіць там с поўчаса, баба і кажа: «Ну, усё. Бог пасвяціў ужо ўсё. Бог на свеце ўсё свеця. Эта, думаеця, папы? Бог тры разы махне свячонай вадой, і ўвесь свет, усю зямлю асвеця».

Бог на небі хрэстам махне ў ваду пасвяцёную і махне, і ўвесь свет, усю зямлю, зямны шар пасвеця.

На Вялікдзень бывая. Баба пабудзя (у храме), гаворя: «Уставайця. Сонца будзя іграць». І палядзіма, ці, можа, у вачах, яно разнымі колярамі на Вялікадня. Дак як сонца ўзыходзя, толькі ўзыходзя, баба: «Хадзіцця, дзеці, глядзіцця, гуляя сонца». І сонца тое пачане ўжо гуляць. Дак разнымы, во як радуга, і так во, як хто кружа там, і разнымы: і сінімы, і галубымы, і розавымы, і краснымы, і жоўтымы, які ё на свеці цвет, і ўсякімы цвятамы яно кружыцца. А тады перастае. Доўга кружыцца, тады перастае.

Баба: «Ну, усё, сонца ўжо пагуляла Гасподняя».

Баба і кажа: «Бог рад. І сонца радуіцца, што Ісус Хрыстос аджываўся. Дак, бачыш, як гуляя. І пераліваіцца красіва. Ой, так глядзіш і думаіш: "Як радуга"».

Люба глядзець. І тады ўжо нагуляіцца, і ўсё. Тады красное здзеліцца ці аранжавае, і ўзыходзя. Хто гаворя: «Красуіцца сонца». Хто: «Гуляя». Но набальша: «Гуляя сонца».

Гатаваліся к Вялікадню. Еслі дзе сіряты, матка будзя казаць: «Колькі будзім яец красіць?» – «Ну, столькі і столькі».

А баба і кажа: «Полячка, нада дзісятак, вот сіряты дзеці, німа ні бацькі, ні маткі, нада і ім аднесць». Вот і мы дзісятак… І другія, такія болей набажлівыя людзі. Бацька наш калісь казаў: «Сам не даеш, но сіратаў пакармі». Вот німа ў іх бульбы, баба будзя казаць: «Варячка, аднясі… Куды ты пойдзіш?» – «Да Фідулёнкаў». А яна і кажа: «Можа, там есцічкі німа, вазьмі ім. Вазьміка…»

Кайстры такія, палатно, у адну рэдзь зшыта… Яна насыпя… Я на плечы і нясі. Ня ўсі давалі… Каторыя самы бедна жывуць… А етыя ўсі падзіліліся. К Вялікадню і мяса… Хто б'е… А то ад сцягна адсякая кусок… Нясуць ім. Там Івоніха жыла, дзеда Майкі братава жонка, чэрэз двор жыла ад іх… Яна ім печ затопя і паску спячэ… І мукі ўсі насілі… Калісь жа не было такія куплёныя, баба насея-насея: «Наце нясіця, там Івоніха спячэ пасачку ім».

А то дак самы, матка: «Наця нясіця дзяцям!» У велікодную сыботу. Нанясуць цэлы стол. І на Троіцу і па скрысенням такія прысмакі ім давалі.

А малака кажды раз… Падояць… Сёдні ты падаіла аднясла ўранні… Я… ужо… у абед падоіш. І так усі людзі насілі сіратам.

Мы пытаім: «Баб, звары яец нікрашаных к Вялікадню». Яна гаворя: «Нільзя. Госпадам Богам запряшчона. Ісуса ж Хрыста распіналі, кроў цякла з яго. Нада крашаная яйцо. Сядзіш разгавецца: асвечаная яйцо. Хоць церкву ў нас тады спалілі немцы, не было, дак яна вынясе ўранні, устаня рана-рана, а то і ноч моліцца Богу, а тады вынясе, і ўсігда чось дождзік малінькі пракапая, ета самы схадок ужо.

Дак яна гаворя: «Во, ужо Гасподзь Бог пасвяціў усім. То ў цэркві. Глаўная, Гасподзь Бог пасвяціў яйцы».

Вынясе, яны паліжаць, яна ўнясе, палупя, парэжа, на тарэлачку ці ў місачку: «Бярыця!» Штоб кажды перва яйцо з'еў, а тады ўжо… Перва яйцо з'еш крошачку, яна крошачкамі парэжа, каждаму, колькі чылавек, столькі яна парэжа.

З'ясі яйцо, тады ўжо пахрыстосаюцца: «Хрыстос васкрэс!» – пацалуюцца. Як яйцо з'ядуць, тады ўсё астальноя ядуць.

Прынясе хто *[у школу]*… Мы знаім ужо, што будуць учацялі ругацца, што крашаныя яйцы нясеш. Но плойма ё плойма! Прыдзіма: «Пакажы, якія ў цябе яйцы!» У цыбулі ўсі, а хто ў красцы розавай: «Ой! Красівая! Ну, давай памяняім! У цябе, можа, дома ё». Учыцілка прыходзя: «Хто з яйцамы прышоў?» Ну, усі ж маўчаць, хто прынёс, хто не прынёс – да ўсі ж прыносілі. Хлопцы – тыя – хітрыя, схаваюць у калошы, завяжаць аборкай унізу, а мы куды схаваім? Яна ў сумках паглядзіць: «Січас жа ідзі выкінь!» Ну, жалка ж яйца выкінуць: «Я ня буду выкідаць!» Яна яйцо забірая. Куды яна іх дзяе? Я ня знаю. «Рылігіі папрыносілі сюда! Рылігіозныя яйца». Дзеўкі большыя ў ліфікі хавалі. А мы ліфікаў шчэ не насілі, па дзвянаццаць – па адзінаццаць гадоў, дак ня знаім куды хаваць, да па партах палазя, а тады ўжо дзірэктару далажа, у каго… Тый прыходзя: «Зачэм сюда прынасіла рылігіозныя яйцы?» Маўчыш, утупішся… што мы будзім гаварыць? А ціпер, во, бачыш, век міняіцца.

***Запісаў Генадзь ЛАПАЦІН***

**(*Заканчэнне ў наступным нумары*)**

**Працяг артыкула. Папярэднія публікацыі ў №№ 3, 7, 9–13, 15.**

# Як у Беларусі шукалі камяні для будаўніцтва маўзалея Леніна

***21 студзеня 1924 года памёр Уладзімір Ільіч Ленін. У дні жалобы II з'езд Саветаў 26 студзеня зацвердзіў рашэнне ЦК РКП(б) і ЦВК СССР аб пахаванні цела Леніна ў склепе, які быў бы даступным для наведвання. Такі маўзалей быў хутка збудаваны з лёгкіх парадаў дрэва, там усталявалі саркафаг з целам Леніна.***

У 1929 годзе пачалося будаўніцтва маўзалея з мармуру і граніту па ранейшай канфігурацыі. Было вырашана, што калоны, якія падтрымліваюць верхнюю пліту, мусяць быць выкананыя з камянёў кожнай саюзнай рэспублікі. Аб тым, як выконвалася гэтае даручэнне ў Беларусі, сведчаць дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь.

19 жніўня 1929 года Савет Народных Камісараў Беларускай ССР атрымаў з Масквы пісьмо-тэлеграму аб тэрміновай адпраўцы для будаўніцтва маўзалея дзвюх каменных калонаў чырванаватага колеру памерам 150x40x40 см. Гэтае пісьмо 23 жніўня было накіраванае Беларускай акадэміі навук з рэзалюцыяй намесніка старшыні СНК БССР С. Карпа: «Геалкаму Акадэміі навук. Тэрмінова выслаць камень патрэбнага колеру».

І толькі 30 жніўня вучонымі быў падрыхтаваны адказ, што ў Беларусі няма такіх камянёў, якія маглі б адпавядаць патрабаванням будаўнікоў. Пры гэтым адказ быў напісаны такой акадэмічнай мовай, што старшыня Саўнаркама М. Галадзед на пісьме зрабіў наступны запіс (мова арыгінала):

*«Раз'ясніць падпісаўшым гэту адносіну, што Саўнаркам не вучнёўская аўдыторыя для неўразуміцельных лекцый аб "феноскандыі і эратычных валунах", а такая ўстанова, даручэнні якой абавязковыя для выканання ўсімі ўстановамі, у тым ліку і Акадэміі. Лічу абсалютна недапушчальным такія бяздушныя адносіны з боку геалагічнага камітэта да выканання такой пачэснай ролі, як удзел у пабудове маўзалея т. Леніна.*

*Запрасіць асабіста прэзідэнта Акадэміі навук У. Ігнатоўскага даць заключэнне аб тым, якія пароды могуць быць пасланы ў Маскву для будаўніцтва маўзалея і даручыць Геалкаму выслаць іх...*

*Даручыць РСІ (наркамат Рабоча-сялянскай інспекцыі. –* **Заўв. аўт.***) расследаваць і прыцягнуць да адказнасці вінаватых у зацяжцы выканання даручэння Саўнаркама і чаму адказ ішоў з Акадэміі цэлы тыдзень».*

Але сакратарыят СНК БССР у сваю чаргу накіраваў у Акадэмію пісьмо з вышэйзгаданай рэзалюцыяй М. Галадзеда толькі 12 верасня, за што адказныя асобы сакратарыята пазней таксама будуць пакараныя.

На наступны дзень ужо сам прэзідэнт акадэміі навук У. Ігнатоўскі інфармуе СНК, што экспедыцыя для адшукання каменя накіраваная па раёнах рэспублікі. А 14 верасня сакратарыят Акадэміі даведкай за подпісам акадэміка В. Ластоўскага паведамляе, што камень патрэбных памераў, колеру і цвёрдасці знойдзены паблізу Мінска ў мясцовасці Дразды і што для праверкі яго будаўнічай вартасці Акадэмія звярнулася да інжынера Шаркова, будаўніка Дома ўрада.

А тым часам 17 верасня 1929 года калегія Наркамата РСІ, праводзячы расследаванне справы аб высылцы ў Маскву камянёў, адзначала, што «заключэнне Акадэміі навук ад 30 жніўня 1929 года мела характар адпіскі ў форме навуковага трактата аб гістарычных паходжаннях парод і адкладаў на паверхні і глыбіні зямлі Беларусі без канкрэтнага месца знаходжання і пароды каменя». Калегія прапанавала прыцягнуць часова выконваючага абавязкі прэзідэнта Акадэміі Казака, дырэктара геалагічнага інстытута Бліадуха, а таксама вінаватых з боку кіраўніцтва справамі СНК БССР да адміністрацыйнай адказнасці.

Здавалася б, меры прынятыя, камяні знойдзеныя. Заставалася толькі распілаваць іх на патрэбныя памеры і адправіць у Маскву. Але дакументы архіва сведчаць аб тым, што на гэтым справа не скончылася.

Напэўна, тыя камяні, што былі знойдзеныя пад Мінскам, па сваёй вартасці не адпавядалі патрабаванням будаўнікоў маўзалея. 12 лістапада 1929 года адбылося пасяджэнне СНК БССР з усё тым жа пытаннем: «Пра пошук і адпраўку ў Маскву калёных камянёў на пабудову маўзалея Леніна». Пастановай СНК даручалася Белдзяржбуду і Горнай групе Вышэйшага савета народнай гаспадаркі БССР прыняць самы актыўны ўдзел у гэтай справе.

22 лістапада Вышэйшы савет народнай гаспадаркі рэспублікі інфармаваў СНК БССР аб тым, што *«каля мястэчка Асвея Полацкай акругі знойдзеныя камяні адпаведных памераў і добрай якасці па цвёрдасці. Пасля іх апрацоўкі пяць штук будуць высланы ў Маскву»*.

Здаецца, на гэтым можна было б ставіць кропку. Але ў архіўнай справе знойдзены яшчэ адзін дакумент па гэтай доўгай гісторыі – пісьмо Цэнтральнага выканаўчага камітэта СССР ад 10 мая 1930 года на імя старшыні СНК БССР:

*«Комиссией по постройке мавзолея В.И. Ленина было поручено тресту "Минералсырьё" войти в сношения с аппаратами Союзных Республик и получить от последних несколько камней для мавзолея В.И. Ленина. До настоящего времени не все выполнили заявку "Минералсырьё". Прошу отдать распоряжение о добыче и доставке в Москву не позже 5 июня 2 камня от Вашей Республики».*

СНК БССР тэрмінова праводзіць дазнанне, і 24 мая 1930 года старшыня Саўнаркама М. Галадзед падпісвае адказ сакратару ЦВК СССР А. Енукідзэ: *«Камень для мавзолея В.И. Ленина послан Белорусской Академией наук ещё 23 января 1930 года (накладная № 378501) по адресу: Московская контора АО "Транспорт". Копии всех документов о высылке камней посланы в Постпредство БССР при Правительстве СССР с предложением срочно выяснить причины неполучения их "Минералсырьём"».*

Спадзяемся, што беларускія камяні ў Маскве былі знойдзеныя. А ці былі яны ўстаноўленыя ў якасці калонаў, што трымаюць пліту маўзалея?

Будзем верыць аўтару кнігі «Маўзалей Леніна» (выдавецтва «Московский рабочий», 1985 г.) А. Абрамаву: *«Все республики участвовали в строительстве памятника... Белоруссия прислала свой лучший гранит, добытый близ Минска, в районе деревни Дрозды... Верхнюю – венчающую – плиту мавзолея установили на 36 колоннах разных пород гранита, доставленных из всех семи союзных республик...»*

Мала таго, у кнізе прыводзяцца звесткі аб тым, што ў будаўніцтве маўзалея прымала ўдзел брыгада муляроў з Гомеля, а брыгадзір Н. Фамянкоў напісаў на цагліне, пакрытай воскам: «Товарищ Ленин, ты всегда живёшь», і ўся брыгада распісалася. Гэтая цагліна з аўтографамі рабочых лягла ў аснову фундамента маўзалея.

Калі хто-небудзь з чытачоў газеты пабывае ў Маскве на экскурсіі на Краснай Плошчы, удакладніце ў гіда верагоднасць гэтай гісторыі.

*Генадзь БАРКУН, гісторык*



*Лявон ЦЕЛЕШ*

## Нататкі падарожніка

*(Заканчэнне артыкула. Пач. у № 15)*

У час наведвання Кракава давялося ўпэўніцца, як мясцовыя ўлады клапоцяцца аб зберажэнні сваіх старадаўніх каштоўнасцяў. Было відаць, што шматлікія старажытныя будынкі адрэстаўраваныя, на вуліцах тысячы, можна сустрэць турыстаў з розных куткоў свету. Яно і не дзіўна: горад з насельніцтвам 800 тысячаў чалавек наведвае штогод больш за 2 мільёны турыстаў. Нам бы так!

У час майго наведвання Кракава, 2-3 красавіка, цвілі алыча, сліва, магнолія, і гэта надавала старажытнаму гораду малады прыгожы выгляд. Якраз у Дзень геолага, 3 красавіка, наша турыстычная група наведала горад Вялічку, славутыя саляныя капальні. Радовішча каменнай солі распрацоўвалася тут з XIII стагоддзя. Ужо больш за 50 гадоў соль у шахце не здабываецца, і капальні ператварыліся ў аб'ект турызму. Штогод Вялічку наведвае каля мільёна турыстаў, а з 1978 года шахта ўваходзіць у спіс аб'ектаў сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. На глыбіні 120 метраў размешчаны рэстаран, а на глыбіні 101 метра дзейнічае ўнікальная каталіцкая капліца, даўжыня залы якой – 54 метры, шырыня – 18 метраў, вышыня – да 12 метраў. Глыбіня ўсёй шахты дасягае 327 метраў, але турыстаў знаёмяць толькі з тымі славутасцямі, якія знаходзяцца на глыбіні да 130 метраў: гэта статуі з солі Мікалая Каперніка, Іагана Гётэ, Папы Рымскага Яна Паўла II, а таксама шматлікія капліцкі, дзе маліліся аб выратаванні сваіх душаў на цяжкай працы шахцёры-солездабытчыкі.



Абраз Маці Божай Юравіцкай у касцёле Св. Барбары

Падарожжы ў старажытны Кракаў і ў Вялічку пакінулі ў мяне незабыўныя ўражанні. Адгарнулася яшчэ адна невядомая мне старонка жыцця і творчасці вядомых беларускіх асобаў за межамі Беларусі. А гэта натхняе на новыя падарожжы і новыя адкрыцці.

*Фота аўтара*



Старажытны цэнтр Кракава

### Адказы на крыжаванку, змешчаную ў № 15

**Уздоўж: 1.** Менеск. **7.** Арда. **8.** Людзі. **9.** Шчучын. **14.** Есаул. **15.** Нага. **16.** Жупан. **17.** Дзед. **18.** Шляя. **19.** Зніч. **20.** Тэза. **22.** Мачта. **24.** Глеб. **26.** Менка. **28.** Жыжаль. **29.** Шанец. **30.** Слова. **32.** Ніва. **33.** Зброя. **34.** Нестар.

**Упоперак: 2.** Ніз. **3.** Калчан. **4.** Кабыла. **5.** Чалядная. **6.** Альгерд. **10.** Паселішча. **11.** Іл. **12.** Уж. **13.** Апалчэнне. **19.** Замчышча. *21.* Абардаж. **23.** Аз. **24.** Грыўня. **25.** Балван. **26.** Ма. **27.** Герб. **31.** Лот.

# Май

**1 – Главацкая Лідзія Рыгораўна** (1936, Смалявіцкі р-н), майстар пляцення мастацкіх вырабаў з саломкі – 80 гадоў з дня нараджэння.

**1 – Мікуліч Ларыса Емяльянаўна** (1956, Іўеўскі р-н), актрыса тэатра лялек, уладальніца прыза Беларускага саюза тэатральных дзеячаў «Крыштальны анёлак» (2010) – 60 гадоў з дня нараджэння.

**1 – Палякоў Мікалай Цярэнцьевіч** (1936, Чавускі р-н), скульптар, які працуе ў галіне станковай і манументальнай скульптуры, аўтар скульптурных партрэтаў С. Прытыцкага, Б. Акрэсціна, Т. Барамзіной, В. Цемрука, Ф. Дзяржынскага, Янкі Купалы, П. Труса, А. Блока, помнікаў, сюжэтных кампазіцыяў – 80 гадоў з дня нараджэння.

**1 – Чарахоўская Раіса Львоўна** (1916, Украіна – ?), украінская і расійская артыстка балета, беларускі дзеяч самадзейнага мастацтва, педагог, заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь – 100 гадоў з дня нараджэння.

**2 – Сухін Аскольд Аўрамавіч** (1941, Расія – 1994), артыст оперы, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, лаўрэат рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў вакалістаў – 75 гадоў з дня нараджэння.

**3 – Альхімовіч Пётр Пятровіч** (1946, Смаргонь), кампазітар, аўтар сімфанічных твораў, харэаграфічных мініяцюраў, музыкі для кіно; з 1990 г. жыве ў Аргенціне – 70 гадоў з дня нараджэння.

**3 – Атаманаў Алег Уладзіміравіч** (1956, Зэльвенскі р-н), паэт, спявак, кампазітар, выканавец уласных песень, культурны і грамадскі дзеяч – 60 гадоў з дня нараджэння.

**3 – Аўгуст Бекю** (1771, Гродна – 1824), беларускі ўрач, педагог, доктар і прафесар медыцыны, доктар філасофіі, адзін з вядучых дзеячаў аховы здароўя Літвы і Беларусі пачатку XIX ст., адзін з першых у Беларусі і Літве пачаў вакцынацыю супраць воспы – 245 гадоў з дня нараджэння.

**3 – Генрык Жавускі** (1791, Украіна – 1866), польскі пісьменнік, публіцыст, аўтар гістарычных твораў, прысвечаных ВКЛ, стваральнік мастацкіх вобразаў дзеячаў беларускай культуры – 225 гадоў з дня нараджэння.

**4 – Пятро Рунец (Пётр Мікалаевіч**; 1911, Пухавіцкі р-н – 1997), пісьменнік – 105 гадоў з дня нараджэння.

**5 – Борзабагаты Уладзіслаў Канстанцінавіч** (1831, Навагрудскі р-н – 1886), рэвалюцыянер-дэмакрат, удзельнік паўстання 1863 – 1864 гг. у Беларусі – 185 гадоў з дня нараджэння.

**5 – Булацкі Рыгор Васільевіч** (1921, Бабруйскі р-н – 1999), вучоны ў галіне гісторыі журналістыкі, адзін з заснавальнікаў беларускай школы журналістыкі, педагог – 95 гадоў з дня нараджэння.

**5 – Гарбатоўскі Віктар Ціханавіч** (1936, Горацкі р-н – 2002), хормайстар, кампазітар, дзеяч самадзейнага мастацтва, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь – 80 гадоў з дня нараджэння.

**5 – Пацехін Васіль Васільевіч** (1906, Расія – 1963), тэатральны рэжысёр, заслужаны артыст Беларусі – 110 гадоў з дня нараджэння.

**5 – Печкін Ярамір Аляксандравіч** (1926, Расія – 1976), скульптар, архітэктар, аўтар шэрагу помнікаў воінам, загінулым у Вялікую Айчынную вайну, – 90 гадоў з дня нараджэння.

**5 – Якавенка Васіль Цімафеевіч** (1936, Светлагорскі р-н), пісьменнік, публіцыст, грамадскі дзеяч, аўтар раманаў, аповесцяў, нарысаў, эсэ, артыкулаў, твораў для дзяцей – 80 гадоў з дня нараджэння.

**6 – Гусеў Валянцін Іванавіч** (1911, Расія – 1983), архітэктар, педагог, заслужаны архітэктар Рэспублікі Беларусь (1969) – 105 гадоў з дня нараджэння.

**6 – Сімураў Аляксандр Трафімавіч** (1921, Гарадоцкі р-н – 2007), журналіст, пісьменнік, заслужаны работнік культуры Беларусі (1974), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1978) – 95 гадоў з дня нараджэння.

**6 – Станіслаў Баніфацый Юндзіл** (1761, Воранаўскі р-н – 1847), прыродазнаўца, батанік, заолаг, адзін з першых даследчыкаў расліннасці Рэспублікі Беларусь, заснавальнік батанічнага сада ў Вільні – 255 гадоў з дня нараджэння.

**8 – Іаан Рыльскі** (свецк. **Пашын Іван Дзмітрыевіч**; 1881, Мазырскі пав. – 1938), рэлігійны дзеяч, святы, епіскап – 135 гадоў з дня нараджэння.

*Дзе варта пабываць*

## «Брагінскі кірмаш» ды іншыя цікавосткі

***8 і 9 мая ў гарадскім пасёлку Брагін на Гомельшчыне адбудзецца свята «Брагінскі кірмаш». Яго мэта – паказаць, што кожны жыхар Брагіншчыны робіць і што можа зрабіць, каб палепшыць жыццё ў сваім рэгіёне і ўмацаваць сувязі паміж брагінчанамі і жыхарамі іншых мясцінаў Беларусі.***

Арганізуюць свята грамадская арганізацыя «Беларускі зялёны крыж» і Брагінскі раённы выканаўчы камітэт. Ладзіцца «Брагінскі кірмаш» у межах рэалізацыі праекта «Развіццё патэнцыялу сеткі сямейных клубаў у Чарнобыльскай зоне з мэтай паляпшэння сацыяльна-эканамічнай сітуацыі», што фінансуецца Еўрасаюзам.

Арганізатары адзначаюць, што «Брагінскі кірмаш» абяцае стаць самым буйным святам за апошнія трыццаць гадоў. Вядома, што да сярэдзіны XX стагоддзя ў рэгіёне ладзіліся кірмашы, якія збіралі сялянаў, рамеснікаў, вандроўных акцёраў і музыкаў з Брагіншчыны, Лоеўшчыны, Хойнікаўшчыны, а таксама Чарнігаўшчыны і Кіеўшчыны. Хочацца спадзявацца, што сёлетняе свята стане выходным пунктам для аднаўлення кірмашовай традыцыі ў рэгіёне.

У праграме свята – дзіцячая музычная пастаноўка «Зямелька продкаў», падрыхтаваная вучнямі Брагінскай сярэдняй школы, міні-спектакль «Легенда пра каханне» па матывах гісторыі аб каханні Марыны Мнішак і Ілжэдзмітрыя, выступленне яўрэйскага тэатра «Шалом» з Магілёва са спектаклем «Чемодан воспоминаний» пра Першую сусветную вайну, сярэднявечныя забаўкі, рыцарскія баі, выступленне вулічнага тэатра «Гістрыён», прэзентацыя сямейных клубаў брагінскага краю ды шмат іншага.

А 21 красавіка ў Брагінскім гістарычным музеі з карціннай галерэяй прайшоў круглы стол з удзелам навукоўцаў, мастакоў і дзеячаў культуры. Пад час яго адбылася размова з экспертам праекта «Развіццё патэнцыялу сеткі сямейных клубаў у Чарнобыльскай зоне з мэтай паляпшэння сацыяльна-эканамічнай сітуацыі» Ганнай Выгоннай з грамадскага аб'яднання «Беларускі камітэт ІКАМОС» аб планах і перспектывах вяртання лялечнага тэатра «Батлейка» на Брагіншчыну.

***Паводле інфармацыі арганізатараў***


*У брагінскім музеі*

*Фота Уладзіміра ПУЧЫНСКАГА*

# Малая краязнаўчая энцыклапедыя

***(Пачатак у № 1 за 2003 год)***

**НЯСУ́ЧЫЯ КАНСТРУ́КЦЫІ** – *(заканчэнне артыкула)*. Найбольш старажытныя тыпы нясучых канструкцыяў – стоечна-бэлечныя, вядомыя на тэрыторыі Беларусі з каменнага веку, і вянковыя ў драўляным дойлідстве. У XI – XII стст. з пачаткам манументальнага каменнага будаўніцтва з'явіліся арачныя і купальныя нясучыя канструкцыі крыжова-купальных храмаў. Для архітэктуры готыкі і рэнесансу характэрная каркасная сістэма з крыжовымі, зорчатымі ды інш. скляпеннямі на нервюрах, што перадавалі цяжар перакрыцця на сцены, слупы, калоны, лапаткі, контрфорсы (царква-крэпасць у в. Мураванка Шчучынскага р-на, Траецкі касцёл у в. Ішкалдзь Баранавіцкага р-на). У архітэктуры барока і класіцызму стоечна-бэлечныя і арачныя нясучыя канструкцыі спалучаліся з цыліндрычнымі на распалубках, корабавымі ды інш. скляпеннямі і купаламі, што атрымалі багатае дэкаратыўнае аздабленне з выкарыстаннем элементаў класічнага архітэктурнага ордэра (касцёл езуітаў у Нясвіжы, палац у в. Шчорсы Навагрудскага р-на), размалёвак, скульптурнай пластыкі.


*Контрфорсы (Траецкі касцёл у в. Ішкалдзь)*

У архітэктуры несапраўднай готыкі нясучымі канструкцыямі часам былі асобна стаячыя контрфорсы з аркбутанамі (касцёл у в. Гервяты Астравецкага р-на).


*Аркбутан (касцёл у в. Гервяты)*

У савецкай архітэктуры з развіццём індустрыі домабудавання з'явіліся нясучыя канструкцыі ў аб'ёмна-блочным будаўніцтве, буйнапанэльным будаўніцтве, буйнаблочным будаўніцтве.

**НЯЎВА́ЖНЫ Флярыя́н (Nieuważny Florian)** – нарадзіўся 30 красавіка 1929 г. у г. Жывец (Польшча). Скончыў Кіеўскі ўніверсітэт (1954). Доктар філалогіі габілітаваны, прафесар Варшаўскага ўніверсітэта. Вядомы польскі славіст, спецыяліст па ўсходнеславянскіх літаратурах. Выдаў манаграфіі пра У. Маякоўскага, І. Эрэнбурга, шматнацыянальную савецкую літаратуру, украінскую літаратуру. Аўтар шматлікіх артыкулаў пра Янку Купалу, Якуба Коласа, В. Быкава, Максіма Танка, У. Караткевіча і інш. Даўно і плённа перакладае на польскую мову беларускую прозу і паэзію – ад Янкі Купалы і М. Багдановіча да Р. Барадуліна, А. Кудраўца і Л. Дранько-Майсюка. Выдаў у сваім перакладзе анталогію беларускай, украінскай і расійскай паэзіі «На той зямлі» (1998).

**НЯЧЫ́СЦІКІ** – у даўніх вераваннях беларусаў абагульненая назва ўсёй «нячыстай сілы», чарцей, злыдняў і інш. злых істотаў народнай дэманалогіі.

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 08 мая 2014 г.
Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры»; Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамасны – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Вітольд Ермалёнак, Алесь Карлюкевіч, Людміла Кірухіна, Адам Мальдзіс, Сяргей Мітраховіч, Вячаслаў Рагойша, Павел Сапоцька, Віктар Скорабагатаў, Тадэуш Стружэцкі.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6.
Тэл. 283 28 26.
Тэл./факс 334-42-03
E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае.
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў у рэдакцыю павядамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, аснoўнае месца працы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтараў могуць не адлавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 28.04.2016
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Карканеўская, 14).
Ліцэнзія ЛП № 02330/85 ад 23.01.2014.
Заказ 296.
Тыраж 688 асобнікаў.